М. Калінін.

АБ КОМУНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

(ДАКЛАД НА СХОДЗЕ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА ГОР. МАСКВЫ 2 КАСТРЫЧНІКА 1940 ГОДА).

(Працяг. Пачат. 2 стар.).

ёсць комуністычнса. Мне ўяўляецца, што ў г.с чалавецтва не было больш б.ага грамадства, чым комуніс.е. Ды гэта і натуральна: бо раджэнне-ж сродкамі, іх выдат.е толькі ў комуністычным гра.е знаходзіцца ў руках вы.ў. Я думаю, няма асаблі. трэбы даказваць, што вытво. льш эканомны ў выдаткаван.м эксплататар ці захватчык. га дабра.

Гісторыя не прыв. людзей берагчы грамадскую .сць, а аматараў раскрадаць .ласнасць заўсёды было дастат. Казнакрадства было харак. рысай ранейшай сістэмы к.р., а казна была дойнай карова чыноўнікаў. Зразумела, так. парадкі развівалі бясклопатна. матаўства і ў адносінах ас. маёмасці, а пагарда .мадскай маёмасці была зверху.

Але гэта раскрадання роднага здабытку, чалавечай пр. якое мы наглядалі ў мінулы. ўляецца не больш, як дзіця. урасцю ў параўнанні з тым, як. радаецца чалавечая праца .асным капіталістычным грамад. Можна смела сказаць, што цяп. кожны дзень пускаюцца на пав.ільёны прапалзён з тым, каб. рыць працу мінулага. А колькі. жаецца каштоўнейшых дараў. роды, колькасць якіх абмяжова. зямлі! Ужо толькі за адно. злачынства перад чалавецтв. піталізм заслугоўвае скарэйша. знішчэння.

Беражлівасць у агульн. лансе дзяржаўнай вытворчас. з'яўляецца плюсавай частка. днага здабытку. І гэта частк. іншна з года ў год расці, як. ьтат павышэння нашай культ.і.

Таварышы, артыкул 131 .стытуцыі дае багацейшы мат. для комуністычнага выхава. .

V

Неабходным састаўным .тэм. комуністычнага выхавання .ўл.ецца таксама развіццё . да радзімы, да сацыялістычна.мы, развіццё совецкага патрыят.

Упершыню слова «патр. з'явілася ў перыяд француз. рэвалюцыі 1789—93 гг. П.тамі тады называлі сябе барац. за народную справу, абаронцы публікі ў процівагу здрадн.ікам прадажнікам радзімы з лагера.нархістаў.

Але потым гэты тэрмін б. ы карыстан рэакцыянерамі і кір.ымі вярхамі ў сваіх карыслівы. мэтах. Таму да слова «патрыятызм» як у Еўропе, так і ў Царскай Расіі найбольш чэсныя людзі, якія .рбаваліся аб народных патрэбах, заўсёды адносіліся падазрона, гледзячы ў ім нацыянальны шавінізм і неабгрунтаваную самаўпэўненасць кіруючых вярхоў. Нарэшце, пад гэтым сцягам царскія сатрапы губілі далучаемыя народы.

Манаполію на «патрыятызм» захапілі чорнасоценцы, якія дэманстрыравалі свае «патрыятычныя пачуцці» у вулічных пагромах, у збіванні рабочых, інтэлігенцыі, яўрэяў. І наогул да гэтага «патрыятызма» хілілася тады многа ўсякіх цёмных, авантурыстычных элементаў з падонкаў грамадства.

У вачах народа апаганілася слова «патрыятызм». Чэснаму чалавеку было немагчыма прылічваць сябе да «патрыётаў».

Народы, далучаныя да Расіі, якія прыгняталіся, эксплаатыраваліся, рабаваліся і зневажаліся на кожным кроку чыноўнікамі і каланізатарамі, натуральна, ненавідзелі рускую дзяржаву.

Як-бы ў процівагу «патрыятызму» рыцараў бізуна і нагайкі ішоў усё нарастаючым тэмпам прагрэсіўны рух, накіраваны сваім астрыём супроць самаўладства.

Першапачаткова барацьба прагрэсіўных сіл з рэакцыяй захапіла літаратуру, музыку, жывапіс, дзе можна было, па крайняй меры, намёкам выражаць свае адмоўныя адносіны да тагочаснай рэчаіснасці. З цягам часу ў гэту барацьбу пачалі паступова ўцягвацца дэмакратычныя слаі насельніцтва, дзякуючы чаму яна прымала ўсё больш радыкальны характар. Гэты працэс расціў і згуртоўваў праціўнікаў самаўладства, праціўнікаў так званай афіцыяльнай Расіі. У той-жа час ён ствараў нацыянальны апал. вялікага народа ў асобе яго лепшых прадстаўнікоў. Паявілася цэлая плеяда геніяльных і адораных пісьменнікаў, крытыкаў і публіцыстаў, якія высока ўзнялі і праславілі нашу літаратуру, зрабілі яе сусветнай. І не толькі літаратура, але і руская музыка, жывапіс, навука сталі вылучаць сваіх бліскучых прадстаўнікоў, як сапраўдных патрыётаў нацыянальнай культуры.

Гэтыя людзі, якія даражылі сваёй чэсцю, чалавечай годнасцю і грамадскай рэпутацыяй, рашуча адмяжоўваліся ад кваснага афіцыяльнага «патрыятызма». Для іх найвышэй за ўсё было служэнне свайму народу і прабуджэнне сапраўднага патрыятызма. Дзеля гэтай вялікай мэты яны не шкадавалі сваіх сіл і дараванняў. У іх вучыліся, па іх прыкладу .ішлі, і .аважаліся .сокім патрыятызмам сучаснікі і наступныя пакаленні. Глыбока патрыятычная дзейнасць гэтых людзей складае нямала яркіх і захапляючых старонак у гісторыі рускага народа. І калі яны не карысталіся сімпатыямі афіцыяльнай Расіі, то народ, насупроць, аддаваў ім належную пашану, заўсёды шанаваў і будзе шанаваць светлую памяць аб іх.

Увесь гэты працэс барацьбы прагрэсіўных сіл з рэакцыйнымі, гэты працэс росту і кансалідацыі культурных сіл даў магчымасць, па крайняй меры, найбольш свядомым элементам прыгнечаных нацыянальнасцей убачыць другую Расію — Расію благародную, свабодалюбівую, непрыгнятальніцкую, культурную, таленавітую, спрыяючую развіццю ведаў сярод шырокіх мас насельніцтва. Разгорнуты рабочы рэвалюцыйны рух паставіў на чаргу дня, як актуальную задачу, сапраўднае згуртаванне пралетарыяў і працоўных усіх нацыянальнасцей Расійскай імперыі ў іх барацьбе супроць царызма і капіталізма. Імаганні Леніна і Сталіна па стварэнню ўсерасійскай партыі рабочага класа, без якой нямысліма было вызваленне рускага народа і прыгнечаных нацыянальнасцей, няўтомная прапаведзь ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, барацьба большэвікоў супроць усякіх праяў вялікадзяржаўнага шавінізма і мясцовага нацыяналізма — усё гэта збліжала прыгнечаныя нацыянальнасці з рускім народам, прымушала найбольш свядомыя іх элементы знаёміцца з рускай літаратурай, мастацтвам, навукай, з рускімі рэвалюцыйнымі барацьбітамі і тым самым далучала іх да рускай культуры, рабіла іх старонніхамі агульнай, злітнай барацьбы, гэта значыць людзьмі, ужо мыслячымі па-ўсерасійску.

Прапаведзь совецкага патрыятызма не можа быць адарванай, не звязанай з карэннямі мінулай гісторыі нашага народа. Яна павінна быць напоўнена патрыятычнай гордасцю за дзеянні свайго народа. Бо совецкі-ж патрыятызм з'яўляецца прамым наследнікам творчых спраў продкаў, якія рухалі наперад развіццё нашага народа.

Совецкае жыццё гэта здзіўляюча ярка ілюстрыруе. Дастаткова ўказаць хоць-бы адзін факт. З якім захапленнем раскаваныя народы аднаўляюць у памяці вобразы сваіх эпічных і гістарычных герояў. Яны адлюстроўваюць іх у сваіх лепшых мастацкіх творах, якія вязуць на паказ у Маскву — сэрца совецкіх рэспублік, дзе кожны з іх хоча якбы сказаць усім народам СССР: глядзіце, я з'яўляюся не з чыйей-небудзь міласці членам вялікага саюза народаў, я не чалавек без роду і племя, — вось мая радаслоўная, якой я гарджуся, і хачу, каб і вы, мае браты па працы і па абароне лепшых ідэалаў чалавецтва, палюбаваліся маёй радаслоўнай.

Значыць, совецкі патрыятызм бярэ свае вытокі ў глыбокім мінулым, пачынаючы ад народнага эпаса; ён убірае ў сябе ўсё лепшае, створанае народам, і лічыць найвялікшай чэсцю берагчы ўсе яго дасягненні.

Вялікая пралетарская рэвалюцыя не толькі зрабіла велізарныя разбурэнні, але і паклала пачатак небывалай будаўнічай рабоце. Разам з тым яна прайшла магутным ачышчальным ураганам у галовах дзесяткаў мільёнаў людзей, усяліўшы ў іх бадзёрасць і веру ва ўласныя сілы. Цяпер яны адчулі сябе багатырамі, здольнымі перамагчы ўвесь свет, варожы працоўным масам.

І вось зарадзіўся ўжо совецкі эпас, які з'ядноўвае лінію народнай творчасці далёкай мінуўшчыны і нашай эпохі, абарваную капіталізмам, які варожы гэтай галіне духоўнай вытворчасці. Разгорнуты працэс сацыялістычнага пераўтварэння грамадства высунуў мноства багатых і захапляючых тэм, вартых кісці вялікіх мастакоў. Народ ужо адбірае з гэтых тэм лепшыя зёрны і паступова стварае асобныя зарысоўкі для эпіка-герачных паэм пра вялікую эпоху і яе вялікіх герояў, як Ленін і Сталін.

Ад народа не павінны адставаць нашы таленавітыя літаратары і мастакі. Бо ніколі-ж яшчэ не было для іх столькі і такога ўдзячнага матэрыялу, як у нашу эпоху. Толькі цяпер яны маюць неабмежаваную магчымасць служыць свайму народу і ўкараняць у масы глыбокія пачуцці патрыятызма на аснове вялікіх дзеянняў сучасных пакаленняў.

Мне здаецца, найлепшым узорам служэння совецкаму народу з'яўляецца Маякоўскі. Ён лічыў сябе байцом рэвалюцыі і быў такім па сутнасці сваёй творчасці. Ён імкнуўся зліць з рэвалюцыйным народам не толькі змест, але і форму сваіх твораў, так што будучыя гісторыкі напэўна скажуць, што яго творы належалі вялікай эпосе ломкі чалавечых адносін. Таму я лічу, што Маякоўскі меў права, звяртаючыся да будучых пакаленняў, сказаць:

«Я к вам приду
в коммунистическое далеко
не так,
как песенно-есененный
провитязь.
Мой стих дойдет
через хребты веков
и через головы
поэтов и правительств.
Мой стих дойдет,
но он дойдет не так, —
не как стрела
в амурно-лировой охоте,
не как доходит
к нумизмату стершийся пятак
и не как свет умерших звезд
доходит.
Мой стих
трудом
громаду лет прорвет
и явится
весомо,
грубо,
зримо,
как в наши дни
вошел водопровод,
сработанный
еще рабами Рима».

У гэтай гордай заяве мы чуем велічны голас нашай эпохі, нашых пакаленняў, пераўтвараючых свет на новых пачатках.

Таварышы, гісторыя ўсклала на нас адказную і пачотную задачу — давесці нашу класавую барацьбу да поўнай перамогі комунізма. «Мы павінны рухацца наперад так, каб рабочы клас усяго свету, гледзячы на нас, мог сказаць: вось ён, мой перадавы атрад, вось яна, мая ўдарная брыгада, вось яна, мая рабочая ўлада, вось яна, мая бацькаўшчына...» (Сталін).

А для гэтага мы павінны выхаваць усіх працоўных СССР у духу палкага патрыятызма, у духу бязмежнай любві да сваёй радзімы. Я гавару не пра адцягненую, не пра платанічную любоў, а пра любоў напорыстую, актыўную, страсную, нязломную, пра такую любоў, якая не ведае ніякай літасці да ворагаў, якая не спыніцца ні перад якімі ахвярамі ў імя радзімы.

Вось вам трэцяя асноўная задача комуністычнага выхавання працоўных СССР.

VI

Лічу неабходным спыніцца яшчэ на пытанні аб калектыўнасці. Не трэба асабліва даказваць, што ўкараненне калектыўнасці павінна займаць віднае месца ў комуністычным выхаванні. Я маю на ўвазе тут не тэарэтычныя асновы калектывізма, а ўкараненне ў вытворчасць, у быт, у жыццё грамадскіх навыкаў, стварэнне такіх умоў, пры якіх калектыўнасць складала-б неадлучную частку нашых прывычак, норм паводзін, каб дзеянні гэтыя рабіліся не толькі абдумана, свядома, а выцякалі інстынктыўна, арганічна.

Я гавару пра свядомае культывіраванне такіх навыкаў у народзе.

Паняцце калектыўнасці нельга змешваць з паняццем стаднасці. Напрыклад, калі ў мінулым сяляне натоўпам збівалі канакрада ці калі натоўп укладчыкаў лопнуўшага банка, буянячы, біў шыбы ў банку,—то такія дзеянні, па-мойму, нельга лічыць праяўленнем калектыўнасці. Яны носяць характар стаднасці. Калектыўнасць-жа дапушчае мэтазгоднасць у дзеянні.

Калектыўнасць у практычным жыцці нашага грамадства іграе вялікую ролю, бо яна грунтуецца на базе калектывізма. Мы процістаўім капіталістычнаму грамадству калектывізм-комунізм, упэўненыя ў яго велізарнай перавазе. Ад паспяховасці ўкаранення калектыўных навыкаў у вытворчасці, грамадскага жыцця і быту залежыць у значнай ступені і паспяховасць комуністычнага будаўніцтва.

Калектыўнасць працы, яе кааперыраванасць з'яўляецца асновай вытворчасці. У сацыялістычнай прамысловасці гэта не патрабуе асобных доказаў. Тут гэта зразумела сваёй нагляднасцю рабочым і ўсім, хто звязан з фабрычнай вытворчасцю. Калі ў капіталістычным грамадстве праца паасобнага пралетарыя зусім абязлічваецца і, будучы ўвасоблена ў прадмеце, прападае з поля зроку не толькі рабочага, але і фабрыканта, якога цікавіць толькі прыбытак, то ў нас увасобленая ў прадмет праца на віду ў рабочага. Яна дэманстрыруецца не толькі на месцы вытворчасці, а[illegible] ўстанні. Значыць, вытворца пры сярэдняй [illegible] можа бачыць вынікі сваёй працы. Аднак, мы павінны сваёй выхаваўчай работай пашырыць і паглыбіць успрыйманне кожным работнікам яго індывідуальнага ўдзелу ў агульнай, калектыўнай працы.

Але асабліва неабходна заваострыць увагу на выхаванні калектыўнасці ў вёсцы, у калгаснай вёсцы. Яна праходзіць сур'ёзную школу калектыўнасці, амаль зусім не маючы навыкаў у калектыўнай працы. Хоць у мінулым словы «грамадства», «грамадскія інтарэсы» часам і вымаўляліся на сельскіх сходах, але па сутнасці калектыўнага там было мала. За словамі «грамадскія інтарэсы», «грамадства» апрацоўваліся асабістыя справы кулакоў.

З пераходам на шлях калектывізацыі перад сялянствам паўсталі цяжкія задачы: наперакор усяму мінуламу зламаць, правільней, накіраваць у процілеглы бок сваю псіхалогію, перайсці з работы на сябе на работу на ўсіх. Гэта працэс нялёгкі. І паспяхова развівацца ён мог толькі пад значным націскам і з дапамогай дзяржавы.

Пераход з індывідуальнай, простай працы да калектыўнай, больш высокай і больш складанай працы патрабуе ад людзей куды больш арганізацыйных здольнасцей. І вось, паралельна працэсу зжывання прыватніцкіх нахілаў і накаплення ў сялян-калгаснікаў калектывісцкіх навыкаў ідзе накапленне арганізацыйнага вопыту ў прымяненні калектыўных метадаў працы.

Вось у якіх умовах ідзе комуністычнае выхаванне ў вёсцы.

Ясна, што голы заклік да калектыўнасці, голая агітацыя за яе перавагі перад індывідуальнай работай ужо недастатковы. Прапагандыст, агітатар, выхавацца павінны ўказаць калгаснікам на больш эфектыўныя спосабы работы ці, па крайняй меры, прывесці канкрэтныя прыклады эфектыўнай работы з аналізам прычын яе эфектыўнасці.

Такім чынам, нават такая складаная справа, як выхаванне калек- [illegible] Кір[illegible] найбольш эфектыўнай, павінна прыстасоўвацца да практычнай работы. Іначш кажучы, выхаванне калектыўнасці павінна праводзіцца канкрэтна. Раз'ясняючы сэнс таго ці іншага практычнага працэса, выхавацца адначасова абагачаецца сам практычным матэрыялам для свайго ўласнага тэарэтычнага развіцця. Між іншым, гэта можа служыць наглядным прыкладам адзінства тэорыі і практыкі.

Вось вам чацверты элемент комуністычнага выхавання.

VII

Апладатвараючых фактарам усякай станоўчай работы з'яўляецца культурнасць. Чым больш складаная, кваліфікаваная работа, тым большая патрабуецца культурнасць. Культура нам патрэбна, як паветра, ва ўсім яе шырокім дыяпазоне, гэта значыць ад элементарнай, неабходнай літаральна кожнаму чалавеку да так званай вялікай культуры. Гавораць: чалавек вялікай культуры.

Культурнасць з'яўляецца пэўным паказчыкам ступені развіцця чалавека. А так як развіты чалавек карыстаецца большай увагай, то некаторыя пераймаюць вонкавыя бакі культурнасці. Аб такіх людзях звычайна гавораць: прыбралася варона ў паўлінае пер'е. Аднак, па-мойму, такое меркаванне няправільна, шкодна для развіцця культуры. Разумеецца, у масе людзі спачатку бяруць вонкавы бок. Але паколькі чалавек стараецца набыць вонкавыя бакі культурнасці, яны, у сваю чаргу, уплываюць ужо на пад'ём яго агульнай культуры.

Чаму зараз асабліва востра адчуваецца неабходнасць у павышэнні агульнай культурнасці? За 23 годы совецкага ладу наша эканоміка далёка прасунулася наперад. Тэхнічны ўзровень вытворчасці стаў куды вышэйшы. Машыны, станкі сталі больш складаныя і патрабуюць больш уважлівых культурных адносін. Калі мы перабяром адну галіну прамысловасці за другой, то атрымаем агульны покліч: нам неабходны больш культурныя, чым раней, работнікі. Само сабой зразумела, што адпаведна павысіліся патрабаванні і ва ўстановах.

Калгасная вёска, у сваю чаргу, прад'яўляе каласальны попыт на людзей з павышанай культурнасцю. Трактарыст, камбайнер, механік, аграном, заатэхнік паміма ведання сваёй непасрэднай работы, абавязан мець хоць элементарную культурнасць. Узяць і іншыя прафесіі, хоць-бы конюха. Параўнаўча няцяжка селяніну быць конюхам пры адным—двух конях. А калі на канюшні 20—40 коней, тут патрабуецца ўжо арганізацыйны вопыт і культурнасць. І так ва ўсіх галінах калгаснай гаспадаркі. Каб рухацца наперад, патрэбна культура.

Не шкодзіць таксама напомніць і аб патрэбах абароны краіны. Тут патрабаванні на культурнасць растуць не па днях, а па гадзінах.

Паміма ўсяго культурнасць — гэта чыстаплотнасць на вытворчасці і ў быце.

Уявіце сабе, таварышы, інжынера, добрага інжынера. Ён многа вучыўся, адукаваны чалавек, кіруе заводам, лічыцца каштоўным работнікам. А калі ідзеш па яго заводу, то сам чорт нагу зламае. **(Смех).** Ну, хіба гэта культурнасць? Калі такі інжынер не заўважае гэтага, значыць у яго няма яшчэ самай элементарнай культурнасці, значыць ён па-сапраўднаму не хварэе за свой завод, за сваю вытворчасць.

Я разумею барацьбу за культурнасць у самым шырокім сэнсе слова, каб, напрыклад, з крана не цякла вада, каб у Маскве паменш было клапоў у кватэрах і т. д. Клапы— гэта-ж нецярпімая рэч, гэта ганьба, а людзі ў гэты час задаюць сабе пытанне: якім павінен быць чалавек пры комунізме, якімі ўласцівасцямі ён будзе вызначацца? **(Смех).** Людзі разважаюць пра выхаванне дзяцей, а ў сябе на кватэры наладзілі клапоўнік. Ну, што гэта такое! Хіба гэта культурныя людзі? Гэта — дваранскія цюфякі, якія захаваліся ад старога рускага грамадства. **(Смех).**

* * *

Таварышы, можна было-б спыніцца яшчэ на цэлым радзе пытанняў комуністычнага выхавання, як напрыклад, на ролі партыі, прафсаюзаў, комсамола, спартыўных арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, школы, літаратуры, мастацтва, кіно, тэатра, сям'і і т. д.

Але гэта завяло-б нас вельмі далёка і мы ўпусцілі-б з поля свайго зроку самае галоўнае, што вызначае задачы і змест комуністычнага выхавання працоўных СССР на даным этапе класавай барацьбы.

Я лічу, што асноўныя вехі, пра якія ішла гутарка, павінны вызначаць падыход да комуністычнага выхавання ўсіх нашых арганізацый і ўстаноў, усіх работнікаў, якія непасрэдна займаюцца гэтай справай. Любое практычнае пытанне яны павінны вырашаць з пункту гледжання галоўнага зместу і асноўнай мэты комуністычнага выхавання.

Калі наша выхаванне будзе на выгляд выдатным, але абстрактным, гэта значыць калі яно не будзе прадметна, матэрыяльна звязана з барацьбой за далейшы рост сацыялістычнай дзяржавы і ўмацаванне яе пазіцый ў цяперашняй класавай барацьбе, гэта будзе пародыя на выхаванне.

У цяперашняй складанай міжнароднай абстаноўцы наш народ павінен быць асабліва сабраным, падцягнутым і напружаным у сваёй пільнасці, каб наша сацыялістычная дзяржава была гатова сустрэць любую нечаканасць і ўсякую выпадковасць. У гэту кропку павінны біць усе нашы грамадскія арганізацыі, літаратура, мастацтва, кіно, тэатры і т. д. Гэта і будзе, таварышы, сапраўдным выкананнем волі партыі, указанняў таварыша Сталіна і запаветаў Леніна па комуністычнаму выхаванню мас у даны гістарычны перыяд. **(Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць).**

Добрая работа агітатараў

Шырока разгортваецца агітацыйна-масавая работа сярод насельніцтва Заблудаўскага раёна. На ўсіх 25 выбарчых участках арганізаваны агіткалектывы. Агітатарамі працуе каля 500 чалавек. Арганізавана 300 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Добра арганізавана работа агіткалектыва скуразавода ў гарадскім пасёлку Заблудава. Тут арганізавана пяць паліттурткоў, у якіх праведзена па двое занятак.

Лепшым кіраўніком паліттуртка на скуразаводзе з'яўляецца тав. Скаўронскі. Ён не спыняў работы сярод рабочых з часу выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Тав. Скаўронскага ведае ўсё насельніцтва горада як лепшага агітатара. На заводзе яго вылучылі з нарміроўшчыка начальнікам аддзела тэхнічнага кантролю. Гэта вылучэнне тав. Скаўронскі апраўдвае на практычнай рабоце.

Тое самае можна сказаць і аб тав. Баранскім. Ён таксама не спыняў агітмасавай работы сярод рабочых з моманту былых выбараў.

Партарганізацыя завода вырасціла дзесяткі агітатараў, якія ў сучасны момант вылучаны на розныя кіруючыя пасты.

У сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і надыхоннем XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі сярод рабочых завода разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. Спаборнічаючыя заключылі дагавор з Есікоўскім скурзаводам. З кожным днём павышаецца прадукцыйнасць працы. Рабочыя Вайнштэйн і Перэльчут штодзённа выконваюць нормы выпрацоўкі на 237 процантаў, рабочыя Безрук, Карчэўскі—на 275 процантаў і т. д.

Вялікая агітацыйна-масавая работа праводзіцца сярод насельніцтва. 27 кастрычніка ў 100 вёсках партыйна-комсамольскім актывам былі праведзены сялянскія сходы, на якіх зроблены даклады аб значэнні выбараў у мясцовыя Советы і святкаванні XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Сходы прайшлі арганізавана і актыўна.

Разгортванню агітацыйна-масавай работы ўдзяляецца вялікая ўвага з боку райкома партыі. Сакратар райкома тав. Марголін сам праводзіць семінары кіраўнікоў агіткалектываў, агітатараў. 29 кастрычніка праведзен семінар аб XXIII гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

27 кастрычніка праведзен сход выбаршчыкаў гарадскога пасёлка Заблудава па пытанню аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

...нафта», «Кіраўнафта».

Паведамленне ТАСС

Агенцтва Рэйтэр распаўсюджвае паведамленне, надрукаванае ў амерыканскай газеце «Нью-Йорк таймс», у якім гаворыцца, што за апошнія дні ў Грэцыю прыбылі з Савецкага Саюза ваенныя самалёты ў колькасці не то 120 не то 150 штук.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўсё гэта паведамленне Рэйтэра з'яўляецца фантазіяй яго аўтараў і ні ў якой меры не адпавядае сапраўднасці.

Ваенныя дзеянні паміж Грэцыяй і Італіяй

НЬЮ-ЙОРК, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэчаскі генеральны штаб паведамляе, што грэчаскія войскі стрымліваюць праціўніка «пасля няўначнага адступлення» в перадавых сектарах на фронце ў правінцыі Эпір. На другіх франтах—зацішша.

Авіяцыя праціўніка падвергла беспарадачнай бамбардыроўцы і абстрэлу з кулямётаў горад Патры.

РЫМ, 31 кастрычніка. (ТАСС). У зводцы італьянскага камандавання паведамляецца:

«Нашы часці, працягваючы праціўнікам сованне, дасягнулі ў некалькіх пунктах ракі Каламас (у Грэцыі).

Наша авіяцыя, не гледзячы на цяжкія атмасферныя ўмовы і інтэнсіўны агонь зенітнай артылерыі праціўніка, бамбардыравала порт Патры. Пашкоджаны ваенныя транспарты праціўніка. Бамбардыроўцы падвергліся таксама база Лепанта (Наўпактос), баракі грэчаскіх войск паблізу Мецовон, важныя збудаванні і раёны крыжавання дарог у даліне ракі Каламас. Збіт 1 самалёт праціўніка. Адзін з нашых самалётаў не звярнуўся».

Французскі і швейцарскі друк аб дзеяннях італьянскай арміі ў Грэцыі і Афрыцы

ВІШЫ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Французскі і швейцарскі друк удзяляюць вялікую ўвагу як пачаўшайся італа-грэчаскай вайне, так і магчымаму ў бліжэйшы час ажыўленню італьянскіх аперацый у Егіпце. Вядомы французскі ваенны аглядальнік газеты «Пары Суар» Анры Біду, датыкаючыся італьянскіх аперацый у Грэцыі, заяўляе, што галоўны ўдар, відавочна, будзе накіраван на Салонікі. Салонікі знаходзяцца ў 150 кіламетрах ад Албанскай граніцы. Салонікі маюць вялікае стратэгічнае значэнне. Гэта — адзін з лепшых у свеце партоў, які мае добрую натуральную горную абарону з усходу і з захаду. Салонікі пануюць над усім Эгейскім морам. Калі-б італьянцам удалося захапіць Салонікі, то яны перарэзалі-б Грэцыю на 2 часткі, забяспечыўшы заняцце ўсёй усходняй часткі краіны. Затым Біду, краналючыся становішча італьянскай і грэчаскай авіяцыі, піша, што італьянскія самалёты маюць скорасць у 400—450 кіламетраў у гадзіну і добра ўзброены. Грэцыя-ж мае ўсяго 200 самалётаў, пры чым частка з іх — стары канструкцыі. Біду лічыць, што англійскія паветраныя сілы наўрад ці змогуць аказаць Грэцыі вялікую дапамогу, бо яны заняты ў самой Англіі.

Якія марскія сілы зможа супрацьпаставіць Італіі Грэцыя? На гэта пытанне адказвае газета «Тан», якая прыводзіць даныя аб грэчаскім флоце, у стварэнні якога прымала ўдзел Францыя. Асабісты састаў грэчаскага флота складаецца з 180 афіцэраў, 1.100 унтэр-афіцэраў і 7 тыс. радавых. Самы вялікі ваенны карабель — крэйсер «Георгій Авераў» водазмяшчэннем у 9.500 тон. Ён пабудаван 28 год таму назад і ў апошні час быў мадэрнізіраван. Акрамя таго, грэчаскі флот мае 10 добрых мінаносцаў, частка якіх узброена новымі гарматамі германскай вытворчасці. Грэцыя мае таксама 6 падводных лодак.

У сувязі з чуткамі аб тым, што вайна ў Грэцыі будзе суправаджацца ўзмацненнем італьянскіх аперацый у Егіпце, егіпецкі карэспандэнт швейцарскай газеты «Газет дэ Лозан» наступным чынам ацэньвае англійскія і італьянскія ваенныя магчымасці ў Паўночнай Афрыцы. Ён заяўляе, што італьянцам удалося стварыць у Паўночнай Афрыцы сапраўдны апорны пункт у Лівіі, у той час як нельга лічыць у Егіпце менш моцны. Італія і зараз працягвае ўмацоўваць Лівію і канцэнтраваць там свае войскі, улічваючы вялікае стратэгічнае значэнне гэтай калоніі. З Лівіі можна дзейнічаць у многіх напрамках: на Туніс, Егіпет, англа-егіпецкі Судан і ўсходнюю Афрыку. Італія затраціла на ўмацаванне Лівіі велізарныя сродкі. Ніякія аперацыі супроць Егіпта, піша газета, не былі-б магчымымі, калі-б не было той дарогі, якую італьянцы пабудавалі ўздоўж лівійскага ўзбярэжжа. Разам з тым карэспандэнт падкрэслівае, што ... ... і італьянцамі ... дзіцца пустыня, якую італьянцы не рашаюцца перайсці.

Прадстаячае ўвядзенне картачак у Балгарыі

САФІЯ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Балгарскі міністр гандлю і прамысловасці Загорай заявіў прадстаўнікам друку, што балгарскі ўрад рашыў правесці падліковую перапіс прадпрыемстваў да ўвядзення картачак на прадукты першай неабходнасці. Дырэкцыяй статыстыкі будзе зроблен спецыяльны перапіс насельніцтва, на аснове чаго будуць загатоўлены і разданы насельніцтву харчовыя картачкі. У мясцовасцях з насельніцтвам менш 5 тысяч чалавек картачкі рашана не ўводзіць, а выдаваць размеркаванне прадуктаў па спісках.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе, што налёты на Лондан і ваенныя аб'екты ў Цэнтральнай і Заходняй Англіі працягваліся. Цяжка пашкоджаны авіяцыйны завод, фабрыка паблізу Шэфілда і адзін воінскі лагер. У 300 кіламетрах заходней Ірландыі германскім самалётам патоплена гандлёвае судна праціўніка таннажам у 5 тысяч тон.

Начную бамбардыроўкі тэрыторыі Англіі прынялі больш шырокія маштабы. Былі зафіксаваны ўзрывы і пажары на прамысловых прадпрыемствах і доках па абодвух баках Тэмзы. Акрамя таго, паспяховай бамбардыроўцы падвергліся порты на заходнім узбярэжжы Англіі і цэнтры ваеннай прамысловасці ў Цэнтральнай Англіі, галоўным чынам, у Ковентры. Непрыяцельскія тарпедныя катэры, выкарыстаўшы туманнае надвор'е, прабавалі наблізіцца да берага Фландрыі. Артылерыя германскага ваенна-марскога флота ўзяла гэтыя катэры пад эфектыўны абстрэл і прымусіла іх павярнуць назад. Адзін тарпедны катэр варта лічыць патопленым.

У ноч на 31 кастрычніка англійскія самалёты зноў паявіліся над заходнімі пагранічнымі раёнамі Германіі і скінулі бомбы, якія, аднак, упалі ў поле і толькі пашкодзілі кабель высокага напружання. Праціўнік страціў учора 13 самалётаў. Германская авіяцыя страціла 5.

Заява англійскага міністра харчовага забеспячэння

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Англійскі міністр харчовага забеспячэння Вулсон заявіў, што асенняя засуха і недахоп кармоў знізілі ўдойнасць, і гэта не можа не адбіцца на забеспячэнні малаком у зімовы час.

Як паведамляе газета «Дэйлі геральд», міністэрства харчовага забеспячэння разглядае пытанне аб размеркаванні кармоў, каб знайсці выхад з гэтага амаль паграджаючага становішча.

ПАЖАР У БУДЫНКУ ВАЕННАГА МІНІСТЭРСТВА ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вашынгтона, у рэзультаце ўспыхнуўшага ў будынку ваеннага міністэрства ЗША пажару пашкоджана памяшканне корпуса сувязі, адкуль адпраўляецца зашыфраваныя тэлеграмы. Па загаду ахову галоўным чынам ласы надстраўляючагася ў цяперашні час чацвёртага паверха гэтага будынка. У ніжнія этажы пранікла вада. Па маючыхся звестках, важнейшыя дакументы міністэрства захоўваюцца ў воданепранікальных шафах.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, начальнік штаба амерыканскай арміі генерал Маршал загадаў зрабіць расследванне ў сувязі з неаднаразовым паўтарэннем пажараў у будынку ваеннага міністэрства. У адзін дзень, напрыклад, у гэтым будынку ўспыхнула 8 пажараў.

ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ ГАРОДНІНЫ

Члены ваўкавыскай агароднай арцелі імені Тэдьмана дружна працавалі на сваіх палях. Цяпер яны падводзяць вынікі сваей калектыўнай працы. На плошчы ў 38 гектараў выраслі добрыя агуркі. Добры ўраджай дала капуста, памідоры, бульба і іншыя культуры.

Калгаснікі атрымалі авансам на працадні па 12 кілаграмаў бульбы, па 1 кілограму 800 грамаў капусты, па 3 кілограмы агуркоў, па 1 кілограму 600 грамаў зернавых, па 2 кілограмы іншай гародніны і 11 рублёў грашыма.

Члены арцелі Абрам Камлока атрымаў авансам 4.355 рублёў грашыма. Тамаш Сазон з сваёй жонкай атрымалі 3.981 рубель грашыма і многа гародніны. Давыд Перахтовіч атрымаў 3.789 рублёў грашыма і многа гародніны.

—о—

Калгас перад размеркаваннем ураджаю

Калгас імені Дзяржынскага, Ломжынскага раёна поўнасцю выканаў абавязацельствы перад дзяржавай па здачы збожжа і бульбы.

Выконваючы агратэхнічныя мерапрыемствы, калгаснікі забяспечылі багатага ўраджаю зернавых і бульбы. Яны сабралі сярэдні ўраджай зернавых 13 цэнтнераў з гектара, бульбы — 230 цэнтнераў.

Зараз у калгасе ідзе падрыхтоўка да размеркавання ўраджаю на працадні. Па папярэдніх падліках, калгаснікі атрымліваюць на кожны працадзень па 10 кілограмаў зернавых і па 18 кілограмаў бульбы. Сям'я былога батрака Бранілава Здунчыка за 9 месяцаў выпрацавала 455 працадзён. Пры канчатковым размеркаванні ўраджаю яна атрымае 4,5 тоны зернавых, 6,5 тоны бульбы і звыш 800 рублёў грашыма.

Датэрмінова закончана ворыва зябліва. Узарана 74 гектары ... пры плане 70.

П. Грышчанка.

—о—


Датэрмінова ўносяць грошы па падпісцы на пазыку

Сярод сялян Бацечкаўскага і Ежэўскага сельсаветаў, Беластоцкага раёна, разгарнулася масава-растлумачальная работа. Ва ўсіх вёсках гэтых сельсаветаў поўнасцю ўжо ўнесены грошы па падпісцы.

Нядрэнна арганізавана работа па збору грошай па падпісцы на пазыку ў Пагажэльскім сельсовеце. Тут сабрана 88 працэнтаў грошай ад ўсёй сумы падпіскі; у Бацютаўскім сельсовеце сабрана 90 працэнтаў, Каліноўскім —84 працэнты, Златорскім — 85 працэнтаў, Чорнавескім — 89 працэнтаў.

Побач з перадавымі ёсць і такія сельсоветы, дзе слаба праводзіцца збор узносаў па падпісцы. Напрыклад, у Супраслеўскім сельсовеце сабрана толькі 34 працэнты, Старасельскім — 43, Васількоўскім — 50 працэнтаў. Гэта гаворыць аб тым, што сельсоветы, фінансавыя агенты і ўпаўнаважаныя па падпісцы на пазыку праводзяць недастатковую работу сярод падпісчыкаў.

Н. Янковіч.



Нядаўна закончана будаўніцтва новага ... атнага будынка для 3-й польскай сярэдняй школы (г. Аўгустоў).

На здымку: агульны выгляд школы.

Фота А. Сапіра.

Добры падарунак

Да надыходзячых святочных дзён Беласток атрымае добры падарунак: новую школу, пабудаваную пры савецкай уладзе.

Школа знаходзіцца па Сасновай вуліцы, 60. Будынак школы мае тры паверхі. На першым паверсе будуць размешчаны кабінеты ўрача, дырэктара, піонерскі пакой, бібліятэка, залавая і раздзявальня, на другім — тры вялікіх класы і настаўніцкая, на трэцім — чатыры астатнія класы. У будынку праведзена цэнтральнае ацяпленне. У бліжэйшыя дні сюды пярэйдзе 25-я яўрэйская няпоўная сярэдняя школа.

Сусветны рэкорд тав. Мілеева

29 кастрычніка ў Беластоку выступілі два мацнейшых штангісты Савецкага Саюза тт. Мілееў і Лапідус.

Тав. Мілееў, майстар спорту СССР, чэмпіён СССР 1938 і 1939 гадоў у сярэдняй вазе, устанавіў новы сусветны рэкорд у поўцяжкай вазе, штурхнуўшы правай рукой 108,9 кілограма. Гэтым самым ён пабіў ранейшы сусветны рэкорд (108,4 кілограма), які належыў ленінградцу тав. Шышову.

Тав. Мілееў устанавіў таксама новы рэспубліканскі рэкорд — 77,5 кілограма у рыўку левай рукой.

Новы рэспубліканскі рэкорд для поўлёгкай вагі ўстанавіў майстар спорту СССР, чэмпіён БССР тав. Лапус: ён штурхнуў двума рукамі 118 кілограма.

Цікава адзначыць, што з 35 сусветных рэкордаў па падняццю цяжкасцей штангістам Савецкага Саюза належыць 26.

Беластоцкі яўрэйскі тэатр напярэдадні новага сезону

Пасля паспяховых паўтарамесячных гастроляў у Пінску, Барaнавічах, Слоніме, Гродне і Брэсце у Беласток звярнуўся яўрэйскі драматычны тэатр.

Новы сезон 1940—41 года адкрываецца 7 лістапада, у дзень святкавання гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі п'есай «Юліс (4 дні)» савецкага пісьменніка М. Даніэля ў пастаноўцы рэжысёраў Віскінда і Мінліна. «Юліс» — гэта адна з лепшых п'ес яўрэйскай драматургіі. Яна з поспехам праходзіла у буйнейшых яўрэйскіх тэатрах Савецкага Саюза.

У гэтым сезоне тэатр пакажа 10 новых цікавых пастановак, сярод іх «Стаўленню» — Шолам-Алейхема, «Справа Бейліса» — Шэйніна, «Камчыйскія ткачы» — Грына, «Пір» — Маркіша, «Платон Крэчэт»—Карнейчука, «Бура»—Шэкспіра і іншыя.

Тэатр узначальвае дырэктар тав. Ракіш. Мастацкім кіраўніком з'яўляецца тав. Норвід. У бліжэйшы час калектыў тэатра папоўніцца новымі артыстычнымі сіламі з Кіеўскага яўрэйскага тэатра.

Чырвонаармейская самадзейнасць рыхтуецца да свята

У падраздзяленні, якім камандуе тав. Яршоў, у часць XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі шырока разгортваецца чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць.

Пад кіраўніцтвам тав. Станкевіча арганізаван драматычны гуртоў, які рыхтуе да свята рад пастановак. Добра працуе і музыкальна-харавы гурток, якім кіруе старшы лейтэнант тав. Кузьмін.

У святочныя дні будуць прадэманстраваны дасягненні чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці перад байцамі і камандзірамі нашай часці.

Г. Шыленка.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

... лістапада ў 8 гадзін вечара ў ...кабінеце (Талстога, 9) будзе прачытана лекцыя на тэму: «Крах ...альскай сістэмы».

...екцыю чытае лектар ЦК ...Б)Б тав. Гурвіч.

...ваход па білетах. Білеты ...ць у Доме партасветы.

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-82, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16 10, камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—3086 Тыраж — 10.000 экз. Друкарня Беластокдрук